УДК 947.6

А. У. Казакоў, аспірант

# АБСТАВІНЫ І ВЫНІКІ КНЯСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ З МАСКОЎСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ Ў ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XV СТ.

The article is devoted to the problem of emigration of the representatives of Moscow aristocracy to the Grand Duchy of Lithuania (GDL) in the second half of the 15th century. One of the consequences of the internal political processes in the Moscow state was the proscription of the disgraced princes who fled to the GDL. Being successfully incorporated in the Belarusian noble class, they partially regained their economical might and status they enjoyed while in motherland. That was the main reason for them and their descendants to remain a factor that exerted influence on the policy of the grand princes of Moscow.

Прабыванне прадстаўнікоў арыстакратыі і дваранства рускага паходжання на беларускіх землях Вялікага княства Літоўскага з'яўлялася неад'емнай часткай гістарычных рэалій. Гэта праблема, аднак, дагэтуль не стала прадметам спецыяльнага даследавання, як і адна з яе частак – эміграцыя ўдзельных князёў з Маскоўскай дзяржавы ў Вялікае княства Літоўскае ў другой палове XV ст. У гэты важны для станаўлення Маскоўскай цэнтралізаванай дзяржавы перыяд ВКЛ стала традыцыйным прытулкам для апальных маскоўскіх князёў. Прагнучы рэваншу, яны і ў выгнанні не перасталі прадстаўляць небяспеку для валадароў маскоўскага вялікакняскага пасада, як, напрыклад, І. А. Мажайскі, які планаваў з дапамогай Казіміра IV не толькі вярнуць сваю вотчыну, але і стаць маскоўскім вялікім князем.

Трэба адзначыць, што пытанне, якому прысвечаны дадзены артыкул, тым ці іншым чынам закраналася ў абагульняючых і спецыяльных працах па гісторыі Расіі і Вялікага княства Літоўскага расійскіх дарэвалюцыйных (Н. М. Карамзін, М. К. Любаўскі, С. М. Салаўёў), савецкіх (К. В. Базілевіч, А. А. Зімін), польскіх (Ф. Папэ, Л. Каланкоўскі) і іншых даследчыкаў. Варта асобна адзначыць манаграфію сучаснага расійскага гісторыка М. М. Крома [1], частка якой прысвечана становішчу арыстакратыі праваслаўнага веравызнання ў ВКЛ, у тым ліку і князёў-уцекачоў з маскоўскіх зямель, а таксама артыкул Б. Сідарэнкі [2]. Пры вывучэнні дадзенага пытання нельга абысціся і без грунтоўных прац па генеалогіі, перш за ўсё належачых польскім даследчыкам А. Банецкаму [3] і Ю. Вольфу [4], хоць фактычны матэрыял у іх часта патрабуе ўдакладнення.

Якім чынам прадстаўнікі буйных княскіх родаў Маскоўскай дзяржавы траплялі на беларускія землі? Якім было стаўленне ўрадаў Вільні і Масквы да княскага эмігранцкага асяродку ў ВКЛ? Адказ на гэтыя пытанні дае нам магчымасць больш глыбока асэнсаваць сутнасць узаемаадносін паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, як і беларуска-рускіх сувязяў у акрэслены перыяд увогуле.

У 1425–1453 гг. у Маскоўскай дзяржаве адбывалася вайна за вярхоўную ўладу паміж вялікім князем Васілём II Васільевічам і Яго-ным дзядзькам Юрыем Дзмітрыевічам. Пасля смерці апошняга маскоўскі вялікакняскі пасад сталі аспрэчваць яго сыны – Дзмітрый Шамяка і Васіль Касавокі. Падчас гэтай феадальнай вайны адным з самых надзейных саюзнікаў Васіля II выступаў князь Бароўскі і Серпухоўскі Васіль Яраславіч (род Бароўскіх паходзіў ад князя Андрэя, сына Івана Каліты) [5]. Васальныя адносіны паміж двума Васілямі падмацоўваліся яшчэ і сваяцкімі: родная сястра князя Бароўскага Марыя была жонкай вялікага князя маскоўскага [6, с. 52]. Адным з суб'ектаў, якія адыгрывалі найважнейшыя ролі ў канфлікце, быў і Іван Андрэевіч, князь Мажайскі, які прыходзіўся ўнукам Дзмітрыю Данскому [4, с. 261]. Гэты беспрынцыпны і карыслівы палітык, якога Зімін удала называе "князем-перелетом" [6, с. 161], некалькі разоў пераходзіў з аднаго лагера ў іншы ў залежнасці ад тых выгодаў, якія ён мог атрымаць ад падтрымкі таго ці іншага прэтэндэнта на вялікакняскі пасад у пэўны момант. Мы не станем прасочваць увесь ход падзей феадальнай вайны ў Маскоўскай дзяржаве, а спынімся толькі на цікавячых нас момантах.

У 1445 г. І. А. Мажайскі ў чарговы раз пераходзіць на бок Дзмітрыя Шамякі (менавіта ён стаў галоўным апанентам Васіля II у барацьбе за ўладу пасля паланення брата). У лютым 1446 г. саюзнікі, скарыстаўшыся адсутнасцю вялікага князя ў Маскве, у выніку раптоўнага нападу здолелі захапіць сталіцу, а на наступны дзень ім удалося схапіць і самога Васіля [7, с. 115–117; 8, с. 152]. Апошні быў асляплены, з-за чаго і застаўся вядомы ў гісторыі як Васіль Цёмны. Д. Шамяка быў абвешчаны вялікім князем маскоўскім. Не жадаючы прысягнуць яму, В. Я. Бароўскі "со княгинею, и с детми, и со всеми людми" накіраваўся ў ВКЛ [8, с. 152–153]. Там жа знайшлі прытулак нязгодныя з новай уладай князь С. І. Абаленскі і баярын Ф. В. Басенок. Паплечнікі Васіля II, якія засталіся на радзіме, арганізавалі змову з мэтай яго вызвалення, але іх намер быў раскрыты Шамякам. Пацярпеўшы няўдачу, частка змоўшчыкаў далучылася да сваіх суайчыннікаў у выгнанні [9, с. 204]. Такім

чынам, у ВКЛ апынуўся ўдзельны князь Бароўскі, а таксама служылыя князі: трое Рапалоўскіх (Іван, Дзмітрый і Сямён) і двое Абаленскіх (Іван і Сямён).

Князь Бароўскі разам з іншымі паплечнікамі звергнутага вялікага князя быў прыхільна прыняты вялікім князем літоўскім Казімірам IV. Ён шчодра адарыў Васіля Яраславіча, надаўшы яму вялізныя ўладанні: Бранск, Гомель, Мсціслаў, Старадуб "и иные многие места" [7, с. 117]. Той жа перадаў Бранск у сумеснае трыманне С. І. Абаленскаму і Ф. В. Басенку. Цалкам верагодна, што Васіль Яраславіч мог "падзяліцца" часткай сваёй новай вотчыны і з іншымі князямі-ўцекачамі, але крыніцы аб гэтым не паведамляюць.

Такім чынам, у ВКЛ быў утвораны буйны ўдзел, у якім засяродзіліся эмігранты з Маскоўскай дзяржавы. Аднак, доўга ён не праіснаваў. Зразумеўшы, што не карыстаецца шырокай падтрымкай, Д. Шамяка ў тым жа 1446 г. дае Васілю II у валоданне Волагду і заключае з ім дамову [8, с. 153]. Нягледзячы на гэта, узброеная барацьба хутка аднавілася. Даведаўшыся аб вызваленні Цёмнага, яго паплечнікі ў ВКЛ на чале з В. Я. Бароўскім вырушылі на злучэнне з войскамі вялікага князя. Васіль Яраславіч вёў з сабой значныя сілы, бачачы якія Д. Шамяка і І. А. Мажайскі "убояшеся и побегоша к Галичу" [8, с. 154]. Не без дапамогі "літоўскіх" атрадаў у 1447 г. Васілю II удалося атрымаць важную перамогу (захапіць Угліч), пасля якой ён авалодаў ініцыятывай ва ўзброенай барацьбе аж да смерці Шамякі.

Як відаць, войскі пад камандаваннем князя Бароўскага адыгралі не апошнюю ролю ў кампаніі 1446–1447 гг. Захаваць значныя сілы ён наўрад ці здолеў бы, калі б не меў крыніц на іх утрыманне, якімі, мусіць, і паслужылі яго ўладанні ў ВКЛ.

Тым часам І. А. Мажайскі, бачачы аслабленнне пазіцый Д. Шамякі, сам выношваў планы авалодання маскоўскім вялікакняскім пасадам і шукаў знешняй падтрымкі для іх рэалізацыі. Лютым 1448 г. датуецца дамова паміж Казімірам і князем Мажайскім, ад імені якога выступаў яго цесць князь Фёдар Львовіч Варатынскі, падданы ВКЛ. У выпадку, калі вялікі князь літоўскі "посадит на великом княжении на Московском" Івана Андрэевіча, апошні абавязваўся перадаць яму гарады Ржэву і Мядынь, а таксама быць да яго ў васальнай залежнасці [10, с. 62]. Намеры гэтыя, аднак, рэалізаваны не былі. Ужо ў сакавіку І. А. Мажайскі пераходзіць на бок Васіля II і падпісвае з ім дамову. А ў 1449 г. Казімір заключае пагадненне з Васілём II, якое прадэманстравала адмову ад колішняй актыўнай усходняй палітыкі вялікіх князёў літоўскіх [11, с. 160–163].

Вайна за панаванне ў Маскоўскай дзяржаве скончылася па смерці Д. Шамякі ў 1453 г. Васіль II, выйшаўшы пераможцам з гэтай барацьбы, пачаў умацоўваць сваю ўладу. Найперш яго ўвага была скіравана на І. А. Мажайскага, які неаднаразова прымаў яго бок і здраджваў яму, і, магчыма, аддаў загад аб яго асляпленні. Але выступленне супраць Івана Андрэевіча не было простай акцыяй помсты. Ліквідацыя Мажайскага княства давала Васілю II пэўныя гарантыі бяспекі яго становішча як вялікага князя (асабліва яго непакоілі кантакты яго ворага-саюзніка з ВКЛ). Летам 1454 г. Васіль вырушыў у паход на Мажайск і захапіў яго [8, с. 155]. Не чакаючы расправы над сваёй асобай, Іван Андрэевіч палічыў за лепшае збегчы ў ВКЛ. У Маскве былі занепакоены такім ходам падзей. У тым жа годзе маскоўскі мітрапаліт Іона дасылае ліст смаленскаму епіскаму Місаілу, у якім просіць яго паклапаціцца, каб "от того князя Ивана и от его людей… пакостни какие не было" [12, с. 104].

Чарговай ахвярай палітыкі ўмацавання цэнтральнай улады вялікага князя маскоўскага стаў яго верны паплечнік Васіль Яраславіч Бароўскі. У 1456 г. ён быў схоплены падчас знаходжання ў Маскве, зняволены і пазбаўлены ўдзелу [9, с. 217]. Дзейнічаючы раптоўна, Васіль II пазбег паўтарэння эпізоду з уцёкамі Мажайскага, але сыну Бароўскага Івану і Ягонай жонцы ўдалося збегчы і знайсці паратунак ў ВКЛ. Раней туды ж збег і сын памёршага Д. Шамякі Іван.

Апальныя князі былі з прыхільнасцю прыняты вялікакняскім урадам. Казімір надзяліў іх немалымі ўладаннямі, у тым ліку і на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Іван Шамячыч атрымаў у спадчыннае валоданне Ноўгарад-Северскі, Іван Васільевіч (які стаў называцца ў ВКЛ Яраславічам) – Клецк, Давыд-Гарадок і Рагачоўскую воласць, а Іван Мажайскі – Гомель і Старадуб [4, с. 519, 154, 261]. Пазней удзел апошняга быў павялічаны за кошт Бранска [13, с. 123]. Гэтыя падараванні зрабілі вышэй пералічаных асоб буйнымі землеўладаннікамі ў ВКЛ і забяспечвалі ім матэрыяльнае становішча, адпаведнае іх паходжанню. Аднак, яны ўжо не маглі адыгрываць той палітычнай ролі, якую адыгрывалі раней у якасці ўдзельных князёў Маскоўскай Русі. Васіль II асцерагаўся (і не дарма) магчымага рэваншу з боку ўцекачоў. Як у 1446 г. ВКЛ стала месцам, дзе засяродзіліся паплечнікі Васіля II і адкуль яны аказалі яму падтрымку ў вяртанні "стала", так і цяпер гэта дзяржава магла стаць базай для дзеянняў княскай эміграцыі, на гэты раз накіраваных супраць маскоўскага вялікага князя. [6, с. 163].

Васіль Цёмны прадпрыняў пэўныя дыпламатычныя захады з мэтай абмежавання магчымасцяў для падобных акцый. Заключаючы ў

1456 г. пагадненні з цверычанамі і Наўгародцамі, Васіль II забавязаў іх не прымаць І. Шамячыча і І. Мажайскага ў сваіх землях [11, с. 187; 14, с. 43]. Такім чынам, маскоўскі князь імкнуўся не дапусціць не толькі саюзу паміж апальнымі князямі і ўдзельнымі княствамі Русі, але нават і магчымасці значнай дапамогі першым з боку апошніх.

Заклапочанасць Васіля II не была дарэмнай. Паміж вераснем 1461 г. і канцом сакавіка 1462 г. Іван Васільевіч Яраславіч і Іван Андрэевіч Мажайскі заключылі пагадненне, паводле якога абяцалі адзін аднаму ўзаемную дапамогу ў адваяванні ў вялікага маскоўскага князя сваіх былых вотчын. [11, с. 199–201]. Саюзнікі павінны былі дзейнічаць загадзя і не заключаць сепаратнага "докончания" з маскоўскім вялікім князем. Гэты дуумвірат, аднак, не быў роўным: галоўную ролю ў ім адыгрываў (і, напэўна, выступаў яго ініцыятарам) старэйшы па ўзросце і нашмат больш дасведчаны ў палітыцы Іван Андрэевіч. Яму прызначалася 2/3 усіх зямель і матэрыяльных каштоўнасцяў, якія удалося б захапіць у сумеснай барацьбе. Не выключалася магчымасць заняцця Іванам Мажайскім вялікакняскага пасада. Па невядомых нам прычынах гэта дамова так і не была рэалізавана.

У 1462 г. вялікім князем маскоўскім становіцца Іван III Васільевіч, падчас кіравання якога (1462–1505 гг.) Маскоўская дзяржава праводзіць актыўную знешнюю палітыку на заходнім накірунку, прэтэндуючы і на ўладаранне над "рускімі" землямі ВКЛ. У сярэдзіне 80-х гг. XV ст. першай ахвярай гэтай палітыкі стала Цвярское вялікае княства. У той час яго тэрыторыя была з усіх бакоў аточана землямі, належыўшымі Маскве [15, с. 360]. У выніку вайсковай акцыі Івана III незалежнае Цвярское княства перастала існаваць [16, с. 500]. Вялікі князь літоўскі Казімір, насуперак дамове 1483 (1484) г., не аказаў дзейснай падтрымкі Міхаілу Барысавічу – апошняму князю Цверы [13, с. 460–461]. Падчас аблогі сваёй сталіцы маскоўскім войскам ён збег з горада ў ВКЛ. Як і яго папярэднікі, Міхаіл Барысавіч атрымаў ад Казіміра зямельныя ўладанні (на Валыні і ў Слонімскім павеце), а таксама вялікія грашовыя сумы і матэрыяльныя каштоўнасці [4, с. 547; 13, с. 508].

Іван III таксама праводзіў паслядоўную і мэтанакіраваную цэнтралізатарскую палітыку, павёўшы наступ на правы ўдзельных князёў. У апалу патрапіў Васіль Міхайлавіч Вярэйскі Удалы, пляменнік Івана Андрэевіча Мажайскага [3, с. 190], які раней вызначыўся на службе вялікага князя [16]. Ратуючыся ад надыходзячай расправы, ён у 1483 г. разам з жонкай збег у ВКЛ [6, с. 189]. У Вялікім княстве Васіль атрымаў ад Казіміра прывілей на валоданне Койданавам, Валожынам і Любечам на Дняпры, а пазней і на іншыя землі [13, с. 390–391].

Такім чынам, пры Іване III кола князёў-уцекачоў, аселых у ВКЛ, павялічылася. Да сярэдзіны 80-х гг. Іван Мажайскі, Іван Яраславіч і Іван Шамячыч памерлі, перадаўшы свае вялізныя вотчыны сынам – Андрэю і Сямёну Мажайскім, Фёдару Яраславічу і Васілю Шамячычу адпаведна. Паводле дамовы Івана III з Цвер'ю ад 1484 (1485) г., Міхаіл Барысавіч забавязваўся не даваць ім прытулку ў сваіх землях [11, с. 296]. Падобныя нормы ўтрымлівалі і дамоўныя граматы з Ноўгарадам (1471 г.) [14, с. 46], Разанню (1483 г.) [11, с. 284] і князем на Волаку Барысам Васільевічам (1486 г.) [11, с. 316]. У апошнім выпадку гаворка яшчэ ішла і аб цвярскім князю. Як відаць, Іван III працягваў палітыку свайго бацькі ў адносінах да выганнікаў. Неаднаразова маскоўскія паслы патрабуюць ад Казіміра, а пазней і ад вялікага князя Аляксандра "изменников" з ВКЛ "не отпущати", а калі самі сыдуць, то "опять не приимати". Адпраўляючы дачку Алену, нявесту Аляксандра, у Вільню, Іван III строга забараніў ёй мець якія-небудзь зносіны з князямі-эмігрантамі [18, с. 168]. Ён таксама двойчы спрабаваў вярнуць на радзіму Васіля Вярэйскага, але гэтыя намаганні скончыліся безвынікова [18, с. 82, 211–212].

Міхаіл Цвярскі і Васіль Вярэйскі памёрлі ў ВКЛ, не пакінуўшы нашчадкаў мужчынскага полу. Фёдар Яраславіч здолеў значна павялічыць сваю вотчыну, дадаўшы да яе ў выніку шлюбу Пінск [19, с. 25], але, таксама не маючы нашчадкаў, яшчэ пры жыцці завяшчаў свае ўладанні вялікаму князю Жыгімонту I [20, с. 53]. Князі Сямён Мажайскі і Васіль Шамячыч разам са сваімі ўдзеламі перайшлі ў 1500 г. пад уладу Масквы.

Такім чынам, ў другой палове XV ст. ВКЛ стала традыцыйным прытулкам для апальных князёў з Маскоўскай дзяржавы. Яны прыбывалі туды разам з набліжаным баярствам і слугамі, стварыўшы значны эміграцкі асяродак у ВКЛ. Адыгрываўшыя на радзіме вядучыя ці значныя палітычныя ролі князі ў эміграцыі неслі патэнцыйную небяспеку для маскоўскага ўрада: яны маглі стаць важнай крыніцай інфармацыі аб унутрапалітычным становішчы ў Маскоўскай дзяржаве; прыкладам уласнага становішча яны абвяргалі адну з асноўных ідэалагічных установак маскоўскіх вялікіх князёў у барацьбе за аб'яднанне ўсходнеславянскіх зямель – аб прыгнёце праваслаўнага наельніцтва ў ВКЛ; згубіўшы свой ранейшы высокі статус, яны маглі здзейсніць рэванш і атрымаць у гэтым падтрымку ўрада ВКЛ.

Аднак ні Казімір, ні пазней Аляксандр не выкарысталі тых магчымасцяў, якія давала ім існаванне эміграцкага асяродку былых рускіх удзельных князёў у Вялікім княстве Літоўскім (асабліва падчас феадальнай вайны

ў Маскоўскай дзяржаве 1425–1453 гг.). У канцы XV ст. ініцыятыва на ўсходзе пераходзіць да набіраючай моц Маскоўскай дзяржавы, якая на рубяжы XV–XVI стст. здолела адарваць ад ВКЛ вялізныя тэрыторыі. Гэта стала магчымым не ў апошнюю чаргу дзякуючы паспяховым спробам Івана III перацягнуць на свой бок нашчадкаў Івана Мажайскага і Дзмітрыя Шамякі.

## Літаратура


1. Кром, М. М. Меж Русью и Литвой. Западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI в. / М. М. Кром. – М.: Археографический центр, 1995. – 304 с.
2. Сідарэнка, Б. Эміграцыя з Маскоўскай дзяржавы ў Вялікае княства Літоўскае ў канцы XV – першай трэці XVI ст. / Б. Сідарэнка // Беларус. гіст. часоп. – 2006. – № 4. – С. 21–29.
3. Boniecki, A. Poczet rodów w Wielkim Księstwie Litewskim w XV i XVI w. / A. Boniecki. – Warszawa, 1887.
4. Wolff, J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1895. – 698 s.
5. Боровские // Русский биографический словарь. Сетевая версия [Электронный ресурс]. – 1997–2007. – Режим доступа: http://www.rulex.ru/01020628.htm. – Дата доступа: 16.03.2007.
6. Зимин, А. А. Витязь на распутье: Феодальная война в России в XV в. / А. А. Зимин. – М.: Мысль, 1991. – 286 с.
7. Полное собрание русских летописей, изданное по высочайшему повелению археографической комиссией: в 24 т. / СПб.; Л.: В Типографии Э. Праца, 1841–1921. – Т. 8: Продолжение летописи по Воскресенскому списку. – 1859. – 304 с.
8. Полное собрание русских летописей, изданное по высочайшему повелению археографической комиссией: в 24 т. / СПб.; Л.: В Типографии Э. Праца, 1841–1921. – Т. 23: Ермолинская летопись. – 1910. – 244 с.
9. Полное собрание русских летописей: в 45 т. / Ин-т истории АН СССР. – М.; Л., Издательство АН СССР, 1922–1980. – Т. 26: Вологодско-Пермская летопись. – 1959. – 416 с.
10. Акты, отнсящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией: в 5 т. / . – СПб.: В типографии II отделения Собственной Е. И. В. канцелярии, 1846–1853. – Т. 1: 1340–1506. – 375 с.
11. Духовные и договорные грамоты великих и удельных князей XIV–XVI вв. / Подгот. Л. В. Черепнин. – М.; Л.: Издательство Академии Наук СССР. – 587 с.
12. Акты исторические, собранные и изданные археографической комиссией: в 5 т. – СПб.: В Типографии Экспедиции заготовления Государственных бумаг, 1841–1842. – Т. 1: 1340–1506. – 1841. – 594 с.
13. Литовская метрика. Отд. 1-й. Ч. 1. Книга записей // Русская историческая библиотека. Т. 27 (1). – СПб., 1910. – 872 с.
14. Грамоты Великого Новгорода и Пскова. / В. Г. Гейман [и др.]; Ин-т истории АН СССР; Под общ. ред. С. Н. Валка. – М.; Л.: Издательство АН СССР. – 1949. – 408 с.
15. Клюг, Э. Княжество Тверское (1247–1485) / Э. Клюг. – Тверь: РИФ, 1994. – 431 с.
16. Полное собрание русских летописей, изданное по высочайшему повелению археографической комиссией: в 24 т. / СПб.; Л.: В Типографии Э. Праца, 1841–1921. – Т. 15: Летописный сборник, именуемый Тверской летописью. – 1863. – 503 с.
17. Василий Михайлович Верейский Удалый // Русский биографический словарь. Сетевая версия [Электронный ресурс]. – 1997–2007. – Режим доступа: http://www.rulex.ru/01030164.htm. – Дата доступа: 16.03.2007.
18. Памятники дипломатических сношений древней России с державами иностранными. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством, 1487–1533. / под ред. Г. Ф. Карпова. – 2-е изд. // Сборник Императорского русского исторического общества. Т. 35 (1). – СПб., 1892. – 870 с.
19. Любавский, М. К. Областное деление и местное управление Литовско-русского государства ко времени издания первого литовского статута. Исторические очерки / М. К. Любавский. – М.: Университетская типография, 1892. – 884 с.
20. Литовская метрика. Книга 11: Книга записей 11 (1518–1523) / Подгот. А. Дубонис. – Вильнюс: Mokslo ir enciklopediju leidykla, 1997. – 227 с.